# Адраджэнне і ўкараненне ў сучасную музычную практыку беларускіх народных духавых інструментаў

Музычнае мастацтва Беларусі — адна з найбольш цікавых старонак гісторыі айчыннай культуры. Самабытная і своеасаблівая, яна разам з тым з'яўляецца неад'емнай часткай еўрапейскай і сусветнай музычнай культуры. Асобае месца ў народнай музычнай спадчыне Беларусі займаюць народныя духавыя інструменты. Кожны з іх перш за ўсё — гэта трубка, дакладна вызначаных даўжыні і шырыні. Крыніцай гуку з'яўляецца зменны рух струменю паветра, які напаўняе ўнутраны аб'ём трубкі. Тэмбр гуку залежыць ад узбуджальніка гукавых хістанняў, а таксама ад памеру мензуры. Пры стварэнні духавога інструмента, як класічнага, так і народнага, выкарыстоўваюцца аднолькавыя прынцыпы пры, натуральна, рознай канструкцыі кожнага.



*Майстар па вырабе дуд, музыкант В. Кульпін. 2008.*

Духавыя музычныя інструменты ўзніклі яшчэ ў старажытнасці. Падчас раскопак археолагі знаходзяць свісцёлкі, пішчыкі з ракавін, костак, рагоў і іклаў жывёл. Зразумела, гэтыя знаходкі яшчэ нельга было назваць інструментамі, але яны сталі іх папярэднікамі. На археалагічных раскопках каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў 1972 годзе знойдзена частка інструмента, зробленага з костак маленькай птушкі. Цэлы інструмент (прававобраз дудкі) быў выяўлены пры раскопках старажытнага Ваўкавыска. У літаратурных помніках 11—13 стагоддзяў сустракаюцца назвы «свірэль» (бел. жалейка), «пішчаль», «пасвісцёл». Таксама маюцца сведчанні аб выкарыстанні насельніцтвам касцяных дудачак, труб, рагоў, варганаў.

Інструменты пастулова эвалюцыяніравалі, але ў розных рэгіёнах адрозніваліся і знешнім выглядам, і ладам, і рэгістрам, і выканальніцкімі магчымасцямі. Па сведчаннях вучоных-этнографаў, да пачатку 20 стагоддзя на тэрыторыі Беларусі існаваў шэраг духавых інструментаў, якія трывала ўвайшлі ў народ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ную выканальніцкую практыку. Даволі часта яны згадваюцца ў беларускім фальклоры, казках і песнях. У творах беларускай літаратуры, а таксама ў іх назвах шырока выкарыстоўваюцца народныя духавыя інструменты («Жалейка» Я. Купалы, «Дудка беларуская» Ф. Багушэвіча).

У гэты ж час вёска перастала быць патрыярхальнай і замкнёнай. Многія сяляне пачалі пераязджаць ці проста наведваць гарады, дзе ўсё большую папулярнасць набываў гармонік (акардэон, баян). Паступова гэты інструмент пачаў выцясняць дуду, дудку, жалейку і інш. Гэты працэс працягваўся да сярэдзіны 20 стагоддзя, што прывяло амаль што да страты практыкі ігры на духавых інструментах. Але з пачатку 1980-х гадоў пачаўся актыўны працэс яе адраджэння. Важную ролю ў гэтым працэсе адыграла прафесар Іна Назіна, якая ў сваіх навуковых працах уздымала актуальныя пытанні па папулярызацыі народных духавых інструментаў. Беларускімі музычнымі майстрамі, сярод якіх Віктар Кульпін, Пётр Саламянюк, Аляксандр Жукоўскі, Уладзімір Пузыня, Алесь Лось, Дзяніс Гром, быў рэстаўрыраваны ці нанова зроблены шэраг інструментаў. Да музычнага жыцця вярнуліся акарыны, парныя і поршневыя дудкі, дуды, драўляныя пастуховы трубы і інш.

Сучасны музычны духавы інструментарый беларусаў можна ўмоўна падзяліць на тры асноўныя групы: свістковыя (дудкі, свісцёлкі, акарыны), язычковыя (жалейкі, дуды, саломкі), муштучныя, ці амбушурныя (драўляная труба, рог), інструменты.

## СВІСТКОВЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

*Прыехала каляда ўвечара,*
*Ды прынесла дудак рэшата.*
*Паставіла дудкі на стаўпе,*
*А сама села на куце.*

*(Беларуская народная песня)*

Дудка — адзін з найбольш папулярных у Беларусі свістковых інструментаў, які адносіцца да тыпу падоўжных флейт. На працягу стагоддзяў яна з'яўлялася неад'емным атрыбутам каляндарна-земляробчых і сямейных абрадаў і свят. Выраблялiся дудкі з дрэва і адрозніваліся формамі, памерамі, колькасцю іграваых адтулін. Кожная мела свой лад, а таму мелодыя, якая на ёй выконвалася, падбіралася адносна канкрэтнага гукарада.

Сучасная беларуская дудка мае храматычны гукарад, што дазваляе выкарыстоўваць мноства іграваых прыёмаў. На ёй выконваюцца сольныя партыі віртуознага і песенна-меладычнага характару. Сярод разнавіднасцей дудак: пікала, сапрана, альт, тэнар, бас.

Свісткі і свісцёлкі некалі сталі правобразам акарын — аднаго з відаў глабуальных (шарападобных) флейт. Свой канчатковы выгляд гэты інструмент набыў да пачатку 20 стагоддзя. Сёння можна ўбачыць гліняныя, фарфоравыя, драўляныя і нават пластыкавыя акарыны розных форм і памераў. Найчасцей у Беларусі акарыны выкарыстоўваліся для аматарскага музіцыравання. На іх выконвалі песенныя, абрадавыя, танцавальныя мелодыі. З-за таго што акарына — інструмент празрыстага і мяккага гучання, яна падыходзіць для выканання і напеўных мелодый, і віртуозных найгрышаў. Апошнім часам акарыны выкарыстоўваюцца як у аматарскіх народных інструментальных калектывах, так і ў рок-групах, а таксама ў прафесійных ансамблях.

Да свістковых інструментаў можна аднесці парныя і поршневыя дудкі, менш распаўсюджаныя, але якія таксама прымяняюцца ў выканальніцкай практыцы.

Парныя дудкі на тэрыторыі Беларусі былі ўпершыню зафіксаваны на Магілёўшчыне. Яны могуць быць мінорнага і мажорнага ладу. Авалоданне ігрой на гэтым інструменце патрабуе настойлівых заняткаў, каб здолець злучыць дзве лініі ў адну мелодыю.

Поршневая дудка ўяўляе сабой трубку са свістам і поршнем, які перамяшчаецца ўнутры ствала. Поршань рухаецца ўверх і ўніз, у выніку чаго падаўжаецца ці пакарочваецца слуп паветра і гукавысотнасць змяняецца. Ігра на такой дудцы патрабуе ад музыканта вельмі тонкага слыху і пастаянных заняткаў.

## ЯЗЫЧКОВЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

*Грай, грай, жалеечка,*
*Грай, грай, гудлівая,*
*Выйграй з вясною і долечку мне*
*З пушчаю, з птушкамі,*
*З вольнымі ветрамі.*
*Грай мне аб шчасці, грай аб вясне!*

*(Янка Купала)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Злева направа: І. Еўдакімаў, А. Еўдакімаў. 1999.*

Да найбольш пашыраных у практыцы выканання язычковых інструментаў адносіцца жалейка — драўляная трубка, з аднаго боку якой знаходзіцца раструб з рога каровы ці звычайны драўляны, з іншага — муштук з пішчыкам. Гук інструмента пранізлівы, моцны. Самым раннім сведчаннем яе бытавання на тэрыторыі Беларусі можна лічыць выяву на іконе 14 стагоддзя «Маці Божая з хорам анёлаў». У наш час існуюць жалейкі двух відаў, дыятанічныя і храматычныя, дыяпазонам у адну актаву. На іх можна выконваць як напеўныя, так і танцавальныя мелодыі. Цудоўна гучыць жалейка сольна, у інструментальных ансамблях і аркестрах.

Жалейка, вырабленая са сцябла спелага жыта ці пшаніцы, называецца саломкай. Гучыць гэты музычны інструмент мякка і досыць моцна. Звычайна на ім выконваюць мелодыі каляндарна-абрадавых песень і народныя найгрышы:

*Эх, без дудкі, без дуды*
*Ходзяць ногі не туды.*
*Ну а як дуду пачуюць, —*
*Самі ножанькі танцуюць!*

*(Беларуская народная песня)*

Дуда — старажытны беларускі інструмент складанай канструкцыі. Такога роду інструменты распаўсюджаны ў многіх краінах свету, але назвы іх адрозніваюцца: у рускіх гэта валынка, ва ўкраінцаў — каза, у балгараў — гайда, у французаў — мюзет, у шатландцаў — біг пейп і інш.

Беларуская дуда складаецца з чатырох асноўных частак: скуранога меха, драўлянай трубкі (соскі), праз якую падаецца паветра, жалейкі і бурдона.

Падчас ігры выканаўца трымае дуду паміж тулавам і локцем. Дудар падае паветра праз соску інструмента ў скураны мяшок. Калі мяшок напаўняецца, ігравыя трубкі — жалейка і бурдон — пачынаюць гучаць. У 16—17 стагоддзях дуду можна было пачуць у сядзібах вядомых людзей. На ёй ігралі як сольна, так і ў ансамблі са скрыпкай і іншымі інструментамі. Дудар знаходзіўся ў пашане і быў запатрабаваны на святах і народных гуляннях.

## АМБУШУРНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

*Іграюць сурмы баявыя,*
*Віхор разносе іхні звон, —*
*І песні дзіўныя такія*
*Ад іх лятуць да ўсіх старон.*

*(Янка Купала)*

Да амбушурных народных інструментаў адносяцца драўляныя трубы (сурмы) розных ладоў і рогі. Здаўна яны выкарыстоўваліся для падачы сігналаў пастухамі, паляўнічымі і ваярамі. Выраблялiся звычайна з дрэва (трубы), рагоў жывёл (быка, барана) ці з дрэва ў форме рога. Гукаатрыманне ажыццяўляецца падачай паветра ў муштук. Інструменты не маюць ігравых адтулін, таму вышыню гуку можна змяніць толькі метадам перадування, павялічваючы ці памяншаючы напор паветра. Труба дае магчымасць атрымаць некалькі гукаў рознай вышыні, рог — толькі адзін або тры.

Адным з пачынальнікаў практычнага прымянення беларускіх народных духавых інструментаў у музычнай практыцы быў Уладзімір Гром, кіраўнік ансамбля «Крупіцкія музыкі», які на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у 1999 годзе стварыў капэлу «Гуды». Дзякуючы яго намаганням і асабістай ініцыятыве ў 2000 годзе ва ўніверсітэце быў ажыццёўлены першы набор студэнтаў для падрыхтоўкі спецыялістаў — выканаўцаў на народных духавых інструментах. Тады ж былі падрыхтаваны і выдадзены першыя ў Беларусі вучэбна-метадычныя, вучэбныя і рэпертуарныя дапаможнікі па народных духавых інструментах, што спрыяла фарміраванню нацыянальнай школы выканальніцтва, вырашэнню праблемы актывізацыі творчасці выканаўцаў на гэтых інструментах, а таксама дазволіла ў значнай ступені пашырыць канцэртны і вучэбны рэпертуар. Сумесныя намаганні Уладзіміра Грома, Аляксандара Крамко, Ігара Мангушава ў рэчышчы адраджэння нацыянальнай музычнай спадчыны прывялі да фарміравання школы ігры на беларускіх народных духавых інструментах.

Музыказнаўча-даследчыя, апісальна-гістарычныя аспекты бытавання і функцыянавання беларускіх народных духавых інструментаў разглядалі ў сваіх работах вядомыя беларускія навукоўцы Іна Назіна, Барыс Нічкоў, Генадзь Мішураў, Аляксандр Карацееў, Альбіна Скорабагатчанка і інш.

На сучасным этапе існавання народныя духавыя інструменты трывала ўвайшлі ў склад шматлікіх ансамбляў, аркестраў, фальклорных і народных калектываў. Высокім прафесійным майстэрствам вылучаецца ігра Аляксандра Крамко — мульціінструменталіста, саліста Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра, заслужанага артыста Беларусі. Ён жа з'яўляецца аўтарам п'ес і твораў буйной формы для народных духавых інструментаў, якія раскрываюць іх багацейшыя віртуозныя і тэмбральныя магчымасці.

У цікавай манеры працуе калектыў «Стары Ольса» — група сярэдневяковай беларускай музыкі. У рэпертуары гурта народныя балады, воінскія песні, творы беларускіх кампазітараў эпохі Рэнесансу, кампазіцыі са зборнікаў «Полацкі сшытак» і «Віленскі сшытак». Для выканання выкарыстоўваюцца максімальна дакладныя копіі старадаўніх беларускіх інструментаў — дуды, ліры, акарыны, жалейкі і інш.

У 1990-я гады ў Мінску быў створаны гурт «Палац», у рэпертуары якога аранжыроўкі беларускіх народных песень у сучаснай манеры папулярнай і рок-музыкі. З народных духавых інструментаў выкарыстоўваюцца дуда, жалейкі, варган і інш.

Спалучэнне розных музычных кірункаў, прыёмы і манеры выканання, выкарыстанне разнастайных народных інструментаў, у тым ліку і духавых, вылучае этна-трыа «Троіцу» з шэрагу іншых этнаграфічных калектываў. Яе ўдзельнікі тонка ўплятаюць сучаснае гучанне і рытмы ў палатно традыцыйнай беларускай народнай песні. Лідар «Троіцы» Іван Кірчук, у якога ўжо сфарміравалася свая нетрадыцыйная манера выканальніцтва, валодае практычна ўсімі духавымі інструментамі.

Актыўна выкарыстоўваюць у сваёй творчасці народныя духавыя інструменты аркестр Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча, заслужаныя аматарскія калектывы «Крупіцкія музыкі», фальклорныя ансамблі «Дударыкі» і «Баламуты», Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі», Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», народны фальклорны ансамбль Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта «Тутэйшая шляхта» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ



*М. Скрамблевіч з дудкай-трысцінай. 2016.*

Найбольш плённа на ніве адраджэння і ўкаранення ў сучасную музычную практыку беларускіх народных духавых інструментаў працуе капэла «Гуды» імя Уладзіміра Грома (кіраўнік Ігар Мангушаў). Гэты калектыў актыўна выкарыстоўвае дудкі розных відаў і ладоў, жалейкі, дуды, драўляныя пастуховы трубы, акарыны, саломкі, а таксама шэраг эпізадычных інструментаў — свісцёлкі, поршневыя і парныя дудкі, варганы. Пры гэтым спрабуе спалучыць ігру на традыцыйных і электронных інструментах. У рэпертуары больш за 50 твораў розных жанраў: беларуская народная музыка, сучасныя аўтарскія і апрацаваныя творы. Інструментарый прадстаўлены шэрагам народных ударных інструментаў ад трашчоткі, бразготкі, шархуноў, драўляных лыжак, бубна да вялікіх вертыкальных барабанаў, якія з'яўляюцца правобразам сучасных літаўр. Спалучэнне розных інструментаў стварае ўнікальнае тэмбральна-каларыстычнае, ні з чым не параўнальнае гучанне. Поўны склад капэлы ўключае ў сябе 4 дудкі (сапрана, альт, тэнар, бас), 2—3 жалейкі розных ладоў, 3—4 дуды, 2—3 драўляныя трубы, акампаніруючую групу і ўдарныя інструменты. Таксама можа дапасоўвацца шэраг эпізадычных інструментаў, сярод якіх акарыны, саломкі, свісцёлкі і інш. Калектыў прымае актыўны ўдзел у мерапрыемствах і канцэртах, якія ладзяцца на тэрыторыі Беларусі, а таксама выязджае за мяжу, прапагандуючы беларускую нацыянальную культуру.

Працэсы, якія сёння адбываюцца ў справе адраджэння нацыянальнай музычнай культуры, народных духавых інструментаў, істотна ўзбагачаюць культурнае жыццё нашай краіны, спрыяюць захаванню і развіццю нацыянальных мастацкіх традыцый і каштоўнасцей.

***І.А. Мангушаў**, прафесар кафедры духавой музыкі факультэта музычнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, мастацкі кіраўнік капэлы «Гуды».*